# РАДЗІМА Ў ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ XX ст. У. КАРАТКЕВІЧА і У. ЛІПСКАГА

***А. А. Жэлуновіч,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры рускай мовы як замежнай*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў;*
***В. Б. Несцяровіч,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры рускай мовы як замежнай*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уладзіміра Караткевіча называюць песняром гісторыі і народа «Зямлі пад белымі крыламі». Пісьменнік імкнуўся ўсёй палітрай фарбаў наблізіць да цэласнасці ўспрымання вобраз беларускага чалавека, нашага народа, радзімы. Па словах А. Адамовіча, ён зрабіў «прарыў у гісторыю свайго народа» для таго, каб шматгранна паказаць Радзіму – «зямлю пад белымі крыламі». «Нястомны вандроўнік і працаўнік, літаратар, чалавек невычарпальна светлага настрою, які ўмее смяяцца як дзіця, усёй душой любіць родных людзей, родную зямлю…», – пісаў Я. Брыль пра У. Караткевіча [1, с. 5].

Даследаванне радзімы, нацыянальнага характару беларуса стала філасофскай сутнасцю творчасці У. Караткевіча, чалавека яркага, самабытнага і ўнікальнага ў беларускай літаратуры. Нарыс «Зямля пад белымі крыламі» – шчырае слова аб радзіме. Да чытачоў пісьменнік звяртаецца даверліва, размаўляе на роўных: «Здарылася так, што я пачаў па-сапраўднаму пазнаваць Беларусь толькі ў вашым узросце. Яна была “да вайны”, і за час вайны моцна забылася… Любоў да Беларусі нараджалася ў самыя галодныя, халодныя і цяжкія часы. І, магчыма, таму стала асабліва моцная... Уся розніца паміж мною і вамі ў тым, што я на нейкія трыццаць год старэйшы за вас і таму крыху болей бачыў. Дажывяце да

майго – можа, будзеце куды больш бывалыя. А пакуль што я хачу трошкі памагчы вам у вашых першых кроках, даць вам ключ ад нашага дома, каб далей вы ўжо асвойваліся ў ім самі» [3, с. 3].

Як сапраўдны патрыёт беларускай зямлі, У. Караткевіч не толькі праз падзеі мінулых дзён паказаў душу нашага народа, але і абышоў і аб’ездзіў усю Беларусь. «Няшмат засталося нават глухіх куткоў, дзе я не пабываў бы. Таму я насмельваюся сказаць, што ведаю сваю краіну і яе людзей. І менавіта таму, я стану гаварыць з вамі толькі аб тым, што сам бачыў і чуў. Гэта будзе кніга, напісаная сведкам, які многае (што датычыць сучаснасці) бачыў на ўласныя вочы. І я дужа хацеў бы, каб вы мне верылі, нават калі я стану вам расказваць самыя незвычайныя рэчы. Таму што жыццё багацейшае, чым мы яго ўяўляем. Жыццё часам бывае настолькі падобнае на казку, што нельга не ўскрыкнуць: “Ды не можа гэтага быць!” Вы можаце спытаць, нашто гэта вам, калі вы самі жывяце тут і шмат чаго бачыце “на свае вочы”. Ну, па-першае, Беларусь вельмі розная. Розняцца людзі, будоўлі, пейзажы. Калі вы жывяце на вёсцы недзе пад Столінам, вы можаце не ведаць, як жывуць вашы браты і равеснікі недзе на Віцебшчыне. Па-другое, калі вы – дзіця вялікага горада, вы можаце ўвогуле не мець уяўлення пра першабытныя лясы недзе над Бярозай-ракой» [3, с. 4]. У. Караткевіч праводзіць па зямлі, якая для яго даражэйшая за ўсё, самы ўтульны і чароўны кут. Аўтарская задума адправіцца з чытачамі ў падарожжа па роднай старонцы рэалізавалася ў нарысе «Зямля пад белымі крыламі» цікава і займальна. Кожная думка аўтара падарожжа па краіне беларусаў сагрэта гуманістычным пачуццём, спасцігнута чулай душой закаханага сына сваёй Радзімы, удумлівага даследчыка і мысліцеля.

Здаўна людзі выкарыстоўвалі колер для абазначэння накірункаў свету. «Белая» значыць цэнтральная. У кнізе «Зямля пад белымі крыламі» можна прачытаць тлумачэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У. Караткевіча: «Па-першае, чаму “Беларусь”? Есць некалькі варыянтаў паходжання гэтай назвы. Прывяду два з іх. Першы: белыя адзенні даўніх вясковых людзей, белыя іхнія валасы, белы колер скуры. Другі. А ён аніяк не супярэчыць з першым. Калі на нашы старажытныя славянскія землі прыйшлі татара-манголы – здолелі адбіцца ад іх амаль адны толькі мы. Паў Уладзімір, Разань, Кіеў. Да Ноўгарада захопнікі не дайшлі толькі таму, што пачаліся дажджы. Мы – адбіліся. І менавіта таму мы “белая”, “чыстая ад нашэсця татараў” Русь. А гэта да шмат чаго абавязвае. І вы заўсёды памятайце гэта» [3, с. 2]. Жыхары «зямлі пад белымі крыламі» вельмі шануюць белы колер – колер дабра і чысціні. У пакоях беларусаў было шмат белага: белыя сцены, столь, белыя фіранкі на вокнах, белы абрус на стале. І апранацца яны здаўна любілі ў выбеленыя льняныя кашулі з чырвоным арнаментам. «Над усёй нашай краінай, наставіўшы белыя ветразі крылаў, плануюць буслы… На вільчыках сялянскіх хат, на дрэвах, на калонах старых разбураных палацаў, на слупах капліц сярод маладога зялёнага жыта. Гнёзды паўсюль. І таму мне здаецца, што ў гэтыя – і не толькі ў гэтыя – дні зямлю нашу, Беларусь, можна назваць “зямлёю пад белымі крыламі”. Вось так і плануюць, плануюць буслы. Ветразі іхнія раскрылены над дрэвамі, пушысты хвост, як веерам, накрыў выцягнутыя ногі. А мне пад іхні палёт асабліва добра думаецца пра Беларусь, нашу з вамі Радзіму» [3, с. 2]. Прачытаўшы пранікнёныя радкі пра радзіму, чытачы будуць ведаць, як і коласаўскае «Мой родны кут!..», паэтычнае і метафарычнае вызначэнне Беларусі як «зямлі пад белымі крыламі».

Кніга «Я тут жыву» У. Ліпскага пачынае краязнаўча-дакументальны цыкл твораў, у якіх пісьменнік запрашае да цікавага падарожжа па родным краі. У. Ліпскі прыгадвае: «Неяк я адчуў: дзеці не зусім добра ведаюць нашу гісторыю. І я пачаў пісаць пра гісторыю Беларусі. Атрымалася кніжка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Я тут жыву” з незвычайнымі картамі краіны па абласцях, рэбусамі, загадкамі. Пасля пайшоў па раёнах – гэта ўжо “Вясёлка над Нёманам”, пра Гродзеншчыну. Карты ўсіх раёнаў упершыню малявалі мастакі, я быў за падказчыка: якія там і дзе замкі, храмы, помнікі, рэкі, звяры, птушкі, рыбы... І якія вядомыя людзі там нарадзіліся. Да кожнага раёна эпіграф, герб раёна расшыфроўваю. Кніжка выйшла тыражом 12 тысяч, гэта як падручнік па радзімазнаўстве» [2, с. 41]. У кнізе «Я тут жыву» прадстаўлены апавяданні пра адметныя мясціны Беларусі – Белавежскую пушчу, возера Нарач, вядомых людзей Беларусі – Цётку, Кастуся Каліноўскага, Мікалая Гастэлу.

Кнігі краязнаўчых нарысаў У. Ліпскага «Свіцязянская русалка», «Вясёлка над Нёманам» знаёмяць чытачоў з адметнымі мясцінамі Гродзенскай і Гомельскай абласцей. «Мая Беларусь... Каб мець права і гонар сказаць так, трэба палюбіць сваю Айчыну. Каб палюбіць сваю родную зямлю, трэба ведаць яе гісторыю, геаграфію, яе спадчыну, яе людзей. Запрашаю ў падарожжа па Гродзеншчыне. У чароўны край нашай Бацькаўшчыны, дзе бруіцца старажытны Нёман», – звяртаецца У. Ліпскі да юных чатачоў. Краязнаўчыя апавяданні змяшчаюць легенды і паданні гродзенскай зямлі і Гомельшчыны.

«Азбука жыцця» – своеасаблівы аўтарскі энцыклапедычны слоўнік, які знаёміць дзяцей з паняццямі і тэрмінамі, размешчанымі ў алфавітным парадку. Па словах У. Ліпскага, яшчэ са школьных гадоў ён выпісваў невядомыя словы, з якімі сустракаўся пры чытанні, імкнуўся грунтоўна растлумачыць значэнне гэтых слоў, а «калі пачаў пісаць для дзяцей, адчуў, што шмат чаго трэба растлумачыць. Узнікла такая незвычайная энцыклапедыя». Апавяданні на кожную літару алфавіта тлумачаць дзецям значэнне слоў, з якімі яны сустракаюцца штодзень ці чуюць іх ад дарослых. «А» – Айчына, абавязкі; «Б» – Беларусь, «В» – вобласці, вёскі. Варта ад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значыць мастацкае тлумачэнне У. Ліпскім значэнняў важных слоў: «мама», «чалавек», «радавод», «патрыятызм», якія дапамагаюць адчуць пачуццё агульначалавечай і нацыянальнай годнасці. Мова кнігі «Азбука жыцця» вызначаецца даступнасцю, эмацыянальнай вобразнасцю. У. Ліпскі звяртаецца да чытачоў з заклікам любіць родны край, вывучаць мінулае сваёй краіны, ганарыцца яе дасягненнямі, любіць і шанаваць сям'ю, быць неабыякавымі да свайго здароўя, расці чулымі і добразычлівымі людзьмі. Пісьменнік прыгадвае ўспаміны з уласнага дзяцінства, з асаблівым пачуццём і шчырасцю піша пра сваю матулю.

Кнігу «Мама. Малітва сына» У. Ліпскі напісаў да стагоддзя сваёй маці, Марыі Адамаўны, беларускай вясковай жанчыны, ласкавай і мудрай. Яе вобраз узнесены пісьменнікам на п'едэстал багіні. Кніга задумана як споведзь, як малітва, таму мае падзагаловак «Малітва сына». Паэзіяй дабрыні прасякнуты ўспаміны сына пра маму, нястомную руплівіцу. «Божа, яна слугавала нам дзень і ноч, бо гэта было яе жыццё. Яна адчувала, што яе прызванне – быць Мамай. Яна ўсіх сваіх дзяцей навучыла любіць зямлю і людзей, і гэта стала яе галоўным урокам маралі» [5, с. 118].

Кніга «Мама. Малітва сына» не толькі знаёміць з лёсам аднаго чалавека, а дапамагае спазнаць філасофію мацярынства, прыгажосць беларускай жанчыны-працаўніцы, маці, зразумець мудрасць і веліч маралі, ідэалаў нашага народа, і ўсё гэта дасягаецца на ўрадлівай нацыянальнай глебе, з выкарыстаннем адметна беларускіх дэталяў штодзённага народнага побыту, працы, свят, з апісаннем родных краявідаў.

Кніга У. Ліпскага «Янкаў вянок» распавядае пра Янку Купалу, з першых старонак паглыбляе ў далёкае дзяцінства паэта, здзіўляе, цікавіць, паколькі напісана надзвычай кранальна, глыбока, душэўна. Як адзначае У. Ліпскі, працуючы над кнігай «Янкаў вянок», ён глыбока, «з алоўкам» вывучыў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

акадэмічнае выданне твораў Янкі Купалы, успаміны, крытычны матэрыял, прысвечаны песняру. Было наладжана шмат сустрэч з нашчадкамі паэта, а таксама шматлікія вандроўкі па купалаўскіх мясцінах, асабліва па Лагойшчыне.

«Кожны дзень я даю справаздачу перад сабой і сваім сумленнем: што зроблена з запланаванага, каму паспеў дапамагчы, што зрабіў для “Вясёлкі”, як бы падсумоўваю вынік. У родных Шоўкавічах, дзе, на жаль, засталося толькі некалькі хатак, мы з вучнямі пасадзілі ліпавую алею памяці аднавяскоўцаў. Свет аб’ехаў, але кожны дзень прыгадваю бацькоўскую вёсачку. Сапраўды, душа чалавека там, дзе ён нарадзіўся, – сцвярджае У. Ліпскі. – А як галоўны рэдактар “Вясёлкі” я мару, каб усміхаліся нашы дзеці, каб яны раслі ў павазе да роднай мовы, традыцый сям’і, каб усёй сваёй працай нам і далей пракладваць сцяжынку да сэрца кожнага маленькага беларуса, а ён каб выхоўваўся ў любові і дабрыні і ганарыўся Радзімай. Вось тады я буду шчаслівы як чалавек, як рэдактар і як пісьменнік» [9, с. 6]. Таксама У. Ліпскі тлумачыць, што кожны дзень жыцця – гэта непаўторнае свята: «Я хацеў бы, каб кожны чалавек гэта ўсвядоміў, і чым раней, тым лепш. Дзень заканчваецца, і такога дня больш не будзе. Дык навучыцеся ж цаніць кожны міг жыцця» [9, с. 7]. Жыццёвы аптымізм пісьменніка дапамагае зразумець: «Жыццё – гэта дар. Жыццё – гэта свята». Такая жыццесцвярджальная думка гучыць ва ўсіх творах У. Ліпскага – таленавітага пісьменніка, лаўрэата літаратурных прэмій імя Янкі Маўра (1993), Васіля Віткі (1997), Міжнароднай прэміі імя лаўрэата Нобелеўскай прэміі А. Швейцара (1998), Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (2001).

---

1. *Верабей, А.* Уладзімір Караткевіч: жыццё і творчасць / А. Верабей. – 2-е выд., дапрац. і выпраўл. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 271 с.

2. *Ждановіч, І.* Сонца ў спадчыну: гутарка з У. Ліпскім / І. Ждановіч // Беларусь. – 2013. – № 4. – С. 41.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Караткевіч, У.* Зямля пад белымі крыламі / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ-ра, 1977. – 176 с.

4. *Ліпскі, У.* Азбука жыцця / У. Ліпскі. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2010. – 207 с.

5. *Ліпскі, У.* Мама. Малітва сына / У. Ліпскі. – Мінск, 1999. – С. 118.

6. *Ліпскі, У.* Свіцязянская русалка: нарысы / У. Ліпскі. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2009. – 168 с.

7. *Ліпскі, У.* Янкаў вянок / У. Ліпскі. – Мінск : Маст. літаратура, 2009. – 222 с.

8. *Ліпскі, У.* Я тут жыву / У. Ліпскі. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2008. – 127 с.

8. *Падліпская, З.* Чалавечае і пісьменніцкае шчасце Уладзіміра Ліпскага : інтэрв’ю / З. Падліпская // Роднае слова. – 2012. – №4. – С. 6–7.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВЛАДИМИР АЛЕКСЕЕВИЧ ПАРАХНЕВИЧ: ЖИЗНЬ И ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ

***П. Г. Игнатович,***
*кандидат исторических наук, профессор,*
*профессор кафедры философии и методологии гуманитарных наук*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств*

В 2019 г. белорусский народ достойно отметил 75-ю годовщину освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков. Благодарные потомки воздают честь славным победителям над фашистскими захватчиками.

Огромный вклад в разгром врага внесли партизаны и подпольщики. Всего по учетным данным Белорусского штаба партизанского движения в республике насчитывалось около 374 тысяч партизан, 70 тысяч человек сражались в подполье. Партизанское движение в Беларуси действовало с самого начала Великой Отечественной войны. За время оккупации в Беларуси были образованы и вели боевые действия 1255 партизанских отрядов. Одна из крупнейших операций партизан по одновременному массовому разрушению железнодорож-